**вернісаж**

# Багацці цёплай краіны

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» праходзіць выстаўка-праект «Падарожжа па Венесуэле». У яе межах дэманструюцца фотаработы, якія дазваляюць убачыць прыгажосць вострава Маргарыта з яго трапічнымі пляжамі і мангравымі лагунамі. На фота пляжы змяняюцца трапічнымі лясамі, вадаспадамі, сярод якіх ёсць і Анхель — самы высокі ў свеце. Гледачам будзе цікава паназіраць і за разнастайнымі раслінамі і жывёламі Венесуэлы.**

Як адзначаюць арганізатары, цяпло гэтай краіны адбіваецца ў творчасці яе жыхароў. Сярод упадабаных музычных інструментаў — арфа, барабаны, маракасы і нават рэйнсцік (дажджавая палачка) — ударны музычны інструмент, які прайгравае гукі вады і дажджу. Карэнныя народы прымяняюць яго ў сваіх рэлігійных абрадах, каб выклікаць дождж. У экспазіцыі можна ўбачыць яркія народныя строі розных рэгіёнаў Венесуэлы, у якіх адзначаюцца галоўныя нацыянальныя святы. Дапаўняе выстаўку тэматычны раздзел «Прыродныя багацці Венесуэлы», які дазваляе даведацца пра сельскагаспадарчыя ўгоддзі, водныя рэсурсы, рыбныя запасы і развіццё аквакультуры, карысныя выкапні, энергетычныя рэсурсы і біялагічную разнастайнасць. Асобны тэматычны раздзел склалі работы ўдзельнікаў выстаўкі-конкурсу дзіцячай творчасці «Венесуэла вачыма дзяцей». Юныя мастакі сталіцы — навучэнцы дзіцячых мастацкіх і сярэдніх школ, а таксама Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

Дык якія ж яны, венесуэльцы? Выстаўка дае адказ і на гэтае пытанне: вясёлыя і эмацыянальныя, добразычлівыя і высакародныя, працавітыя і творчыя, верныя сваім традыцыям і культуры. Упэўніцца ў гэтым можна да 25 ліпеня. Праект арганізаваны Пасольствам Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Рэспубліцы Беларусь сумесна з мастацкай галерэяй «Універсітэт культуры» і прымеркаваны да 211-й гадавіны абвяшчэння незалежнасці Венесуэлы.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ